**Рэкамендацыі па арганізацыі вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» на павышаным узроўні (VIII, IX класы)**

На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучэбны прадмет «Беларуская літаратура» можа вывучацца на павышаным узроўні. Дадатковыя вучэбныя гадзіны (1 або 2 на тыдзень) мэтазгодна выкарыстоўваць на арганізацыю і стымуляванне вучэбнай дзейнасці вучняў па авалоданні ведамі, уменнямі і навыкамі, набыцці вопыту дзейнасці, на развіццё якасцей асобы, творчых здольнасцей і фарміраванне на гэтай аснове прадметных, метапрадметных і асобасных кампетэнцый.

*Табліца 1*

***VIII клас***

| Раздзел вучэбнай праграмы | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (базавы ўзровень) | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (павышаны ўзровень, **+ 1 гадзіна**) | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (павышаны ўзровень, **+ 2 гадзіны**) | Рэкамендацыі па выкарыстанні дадатковых вучэбных гадзін |
|---|---|---|---|---|
| Уводзіны. Чалавек як галоўны аб'ект увагі мастацкай літаратуры, спосабы яго паказу ў творах | 1 | 2 | 3 | Актуалізацыя ведаў вучняў пра літаратуру як мастацтва слова, пра паэзію і прозу як спосабы паказу жыцця; асэнсаванне паняцця аб трох родах літаратуры (эпічны, лірычны, драматычны); удасканаленне чытацкіх і літаратурна-творчых уменняў |
| Роды мастацкай літаратуры | 7 | 11 | 16 | Паглыбленне паняццяў *тэма, ідэя, праблема твора*; выпрацоўка ўменняў параўноўваць аднатэмныя творы розных аўтараў, вызначаць асаблівасці сюжэтнай, кампазіцыйнай будовы п'есы; развіццё ўменняў назіраць за сродкамі раскрыцця характару ў эпічным творы, выяўляць аўтарскую пазіцыю ў драматычным творы, ствараць вусную характарыстыку герояў праз іх паводзіны і ўчынкі, мастацкія дэталі; удасканаленне навыкаў складання партытуры верша (п'есы) |
| Лірычныя жанры | 14 | 19 | 26 | Паглыбленне паняццяў *віды, жанры лірыкі, класічныя формы верша, лірычны герой, вершаскладанне*; замацаванне ўяўленняў вучняў пра |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | народную песню як пра крыніцу лірычнай паэзіі; развіццё ўменняў самастойна аналізаваць тэксты песень у адзінстве іх зместу і формы, параўноўваць аднатэмныя вершы розных паэтаў, назіраць за рухам перажыванняў лірычнага героя з улікам усіх мастацкіх сродкаў (паўтораў, памеру, кампазіцыі, інтанацыі), аналізаваць паэтычны тэкст; набыццё вопыту літаратурна-творчай дзейнасці (дапісванне апошняга радка верша, дапісванне і напісанне твора па апорнай схеме чаргавання радкоў, напісанне вершаў на зададзеную тэму па апорных словах, напісанне трыялета, актавы і інш.); удасканаленне навыкаў выразнага чытання вершаў, розных па змесце, настроі, насычанасці вобразна-выяўленчымі сродкамі мовы; фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі |
| Эпічныя жанры | 13 | 23 | 32 | Паглыбленне паняццяў *эпас як літаратурны род, эпічныя жанры; эпізод, сюжэт, кампазіцыя ў эпічным творы, апавядальнік у творы*; выпрацоўка ўменняў вызначаць тэму і ідэю мастацкага твора, параўноўваць характары галоўных герояў; замацаванне ўменняў заўважаць у творы сутыкненне розных жыццёвых філасофій, бачыць супрацьлегласць жыццёвых пазіцый; удасканаленне ўменняў мастацкага пераказу эпізодаў твора; падрыхтоўка невялікіх вусных празаічных замалёвак на адну з прапанаваных тэм, ацэначных выказванняў пра падзеі, намаляваныя ў творы |
| Ліра-эпічныя жанры | 6 | 9 | 14 | Паглыбленне паняццяў *ліра-эпічныя літаратурныя жанры; паэма: жанравыя асаблівасці, лірычныя адступленні; літаратурная балада, байка*; пашырэнне ўяўленняў вучняў пра аўтарскую і тэматычную разнастайнасць байкі як жанру літаратуры; выпрацоўка ўменняў ацэньваць учынкі персанажаў, выяўляць найбольш напружаныя моманты ў баладзе, алегарычны сэнс у байцы; развіццё ўмення параўноўваць паміж |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | сабой творы ліра-эпічнага жанру; удасканаленне навыкаў аналізу ліра-эпічнага твора; складанне партытуры байкі, балады |
| Драматычныя жанры | 4 | 6 | 8 | Паглыбленне паняццяў *драма як літаратурны род, драматычныя жанры: трагедыя, драма, камедыя; канфлікт, сцэна, карціна, рэпліка, рэмарка;* удасканаленне ўменняў вылучаць эпізоды або дэталі, важныя для характарыстыкі дзейных асоб, устанаўліваць прычынна-выніковую сувязь паміж падзеямі і паводзінамі герояў у творы, характарызаваць героя драматычнага твора па яго словах і паводзінах; выпрацоўка ўменняў карыстацца паняццямі, неабходнымі для аналізу драматычнага твора; развіццё ўменняў выразнага чытання п’есы па асобах; удасканаленне ўменняў інсцэніравання і мізансцэніравання эпізодаў з драматычнага твора |
| Паўтарэнне вывучанага ў VIII класе | 1 | 3 | 4 | Паўтарэнне і абагульненне ведаў вучняў пра літаратуру як спецыфічны від мастацтва; замацаванне паняццяў аб трох родах літаратуры (эпічны, лірычны, драматычны); удасканаленне чытацкіх і літаратурна-творчых уменняў; правядзенне чытацкай канферэнцыі |
| Навучальныя сачыненні | 2 | 4 | 4 | Выкананне навучальных сачыненняў (без павелічэння колькасці саміх работ); падрыхтоўка творчых работ параўнальнага характару (літаратура, выяўленчае мастацтва, кінамастацтва і інш.) |
| Урокі па творах для дадатковага чытання | 4 | 8 | 12 | Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік можа выбраць тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць найбольш дарэчным у пэўным класным калектыве, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе |
| Рэзерв вучэбнага часу | 1 | 3 | 4 | Рэзерв вучэбнага часу настаўнік можа выкарыстаць па сваім меркаванні на чытанне і асэнсаванне літаратурных твораў |
| **Усяго:** | **53** | **88** | **123** | |

*Табліца 2*

## *IX клас*

| Раздзел вучэбнай праграмы | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (базавы ўзровень) | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (павышаны ўзровень, **+ 1 гадзіна**) | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (павышаны ўзровень, **+ 2 гадзіны**) | Рэкамендацыі па выкарыстанні дадатковых вучэбных гадзін |
|---|---|---|---|---|
| Уводзіны. Літаратура як мастацтва слова. Яе грамадскае прызначэнне. Функцыі літаратуры | 1 | 2 | 3 | Актуалізацыя ведаў вучняў пра літаратуру як мастацтва слова; паглыбленне ўяўленняў пра прызначэнне мастацкай літаратуры, яе функцыі, літаратурны працэс. Дыскусія, чытацкая канферэнцыя |
| Чалавек і грамадства. Постаці айчыннай гісторыі ў беларускай літаратуры | 5 | 7 | 12 | Паглыбленне паняццяў *жанр жыція; жанр летапісу; жанр прадмовы;* пашырэнне ўяўленняў пра беларускіх асветнікаў старажытнасці, багацце і разнастайнасць старажытнай літаратуры, яе тэматычнай і жанравай разнастайнасці. Выразнае чытанне, падрыхтоўка паведамленняў |
| Рамантычнае і рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў мастацкай літаратуры | 8 | 13 | 20 | Паглыбленне паняццяў *рамантычны герой; пародыя і бурлеск у літаратуры; фарс і вадэвіль як камедыйныя жанры;* пашырэнне ўяўленняў пра творчасць Яна Баршчэўскага, Адама Міцкевіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча. Падрыхтоўка паведамленняў, прэзентацый, пастаноўка фрагмента твора, складанне планаў, супастаўленне твораў розных відаў мастацтва |
| Нацыянальнае і агульначалавечае ў мастацтве слова | 14 | 24 | 31 | Паглыбленне паняццяў *віды, жанры лірыкі, паэма як жанр; санет; вобраз апавядальніка;* пашырэнне ўяўленняў пра творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага; выпрацоўка ўменняў вызначаць жанравыя асаблівасці мастацкіх твораў. Супастаўленне розных відаў мастацтва, падрыхтоўка |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | паведамленняў, літаратурны дыспут, інсцэніроўка мастацкага твора |
| Чалавек у часе і прасторы ў творах беларускай літаратуры | 14 | 24 | 30 | Паглыбленне паняццяў *псіхалагізм у літаратуры; рытм і рыфма, жанр аповесці;* пашырэнне ўяўленняў пра творчасць Кузьмы Чорнага, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Уладзіміра Караткевіча, Яўгеніі Янішчыц; выпрацоўка ўменняў ацэньваць учынкі персанажаў, выяўляць жанравыя асаблівасці мастацкіх твораў. Выразнае чытанне, складанне рознага роду планаў, падрыхтоўка паведамленняў, літаратурная дыскусія, стварэнне вуснай замалёўкі |
| Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год | 1 | 2 | 3 | Паўтарэнне і абагульненне ведаў вучняў пра літаратуру як спецыфічны від мастацтва, культурны дыялог эпох; удасканаленне чытацкіх і літаратурна-творчых уменняў; правядзенне чытацкай канферэнцыі |
| Навучальныя сачыненні | 3 | 4 | 4 | Выкананне навучальных сачыненняў (без павелічэння колькасці саміх работ); падрыхтоўка творчых работ параўнальнага характару (літаратура, выяўленчае мастацтва, кінамастацтва і інш.) |
| Кантрольнае сачыненне | 2 | 2 | 2 | |
| Урокі па творах для дадатковага чытання | 2 | 5 | 10 | Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік можа выбраць тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць найбольш дарэчным у пэўным класным калектыве, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе |
| Рэзерв вучэбнага часу | 1 | 2 | 4 | Рэзерв вучэбнага часу настаўнік можа выкарыстаць па сваім меркаванні на чытанне і асэнсаванне літаратурных твораў |
| **Усяго:** | **51** | **85** | **119** | |